

# ЯКУШ Іван Сямёнавіч

Нарадзіўся 24 кастрычніка 1919 года ў вёсцы Савічы Дамаўленскага сельсавета Гомельскай вобласці ў сям'і сялян. З дзіцячых гадоў ён марыў стаць настаўнікам, таму пасля заканчэння школы паступіў вучыцца ў Мозырскае педвучылішча, якое паспяхова закончыў у 1939 годзе. Пасля гэтага маладога настаўніка накіравалі працаваць настаўнікам пачатковых класаў у Дзербінскую сямігадовую школу.

У гэтым жа годзе яго прызываюць на службу ў Чырвоную Армію. Службу пачынаў у артылерыйскай палкавой школе малодшых камандзіраў горада Луга. Затым быў накіраваны ў 311–ы ордэна Чырвонага Сцяга гаўбічна – артылерыйскі полк, які размяшчаўся ў мястэчку Дзярэчын Зэльвенскага раёна. У пачатку вайны ў час адступлення ён апынуўся ў калоне, якая рухалася ў бок Навагрудка, разам з іншымі трапіў у варожы палон. Умовы ўтрымання былі жудасныя: людзі знаходзіліся пад адкрытым небам, раз у дзень ім прывозілі вялікую бочку з нейкай мешанінай мукі і вады. За дзень гінула больш за 200 чалавек. Праз некалькі месяцаў іх пагрузілі ў вагоны і адправілі спачатку ў лагер для ваеннапалонных у Польшчу, а затым у Германію.

Чатыры гады знаходзіўся ў фашысцкіх лагерах смерці. Кожны дзень для яго, як і для іншых ваеннапалоных мог быць апошнім. Але прага да жыцця давала надзею на выжыванне, сустрэчу з роднымі. Выжыў толькі цудам. Пасля вызвалення з лагера вярнуўся ў Беларусь. Як і ўсе ваеннапалонныя прайшоў праверку ў НКУС і быў залічаны ў рабочы батальён, пасля расфарміравання якога быў дэмабілізаваны і вярнуўся на Гомельшчыну.

Цягніком даехаў да Зэльвы, а затым пешшу дайшоў да Дзярэчына. Тут сустрэў многа знаёмых і вырашыў застацца. Знайшлося і месца пражывання, пасяліўся на хутары ля Дзярэчына. Муж гаспадыні дома загінуў на фронце і я дапамагаў ёй па хатняй гаспадарцы. Не заўважылі, як пакахалі адзін аднаго, хутка пажаніліся. У раённым адзеле адукацыі яму прапанавалі пасаду дырэктара Алексіцкай пачатковай школы. Праз год атрымаў назначэнне ва Угрынскую школу, у 1956 годзе закончыў завочна Гродзенскі педагагічны інстытут. Да выхаду на пенсію працаваў настаўнікам Дзярэчынскай сярэдняй школы. Памёр 30 мая 2017 года, пахаваны на могілках аг. Дзярэчын.

У 1985 годзе ўзнагароджаны Ордэнам Айчыннай вайны ІІ ступені.